**Далінская Л.І.,**
*аспірантка кафедры*
*бібліяграфіі і дакументазнаўства*

# ТЭАРЭТЫКА-МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ АСПЕКТЫ БІБЛІЯГРАФІЧНАГА ЗАБЕСПЯЧЭННЯ КАРЫСТАЛЬНІКАЎ ПСІХОЛАГА-ПЕДАГАГІЧНАЙ ІНФАРМАЦЫЯЙ

Перад сучаснымі ўстановамі адукацыі і культуры Беларусі стаіць праблема захавання духоўных каштоўнасцей і інтэлектуальных набыткаў. Сёння культурна-асветныя, адукацыйныя, навуковыя ўстановы нашай краіны адчуваюць вялізарную патрэбу ў структураванні інфармацыйнага патоку ў галінах педагагічных і псіхалагічных навук. Тэарэтыка-метадалагічныя аспекты выкарыстання сістэмнага падыходу ў галіновай бібліяграфіі цяпер не распрацаваны на патрэбным навуковым узроўні, практычная дзейнасць па стварэнні адпаведных бібліяграфічных рэсурсаў пакуль што якасна не прааналізавана.

Традыцыйна пад сістэмай разумеюць сукупнасць, складанае адзінства элементаў, паміж якімі існуюць пэўныя адносіны і сувязі. Гэтая дэфініцыя падкрэслівае факт наяўнасці анталагічнага статуса сістэмнага падыходу да аб’екта навуковай бібліяграфіі. Аднак такі погляд на сістэмы канцэнтруе тыя працэдуры і спосабы, якія мы выкарыстоўваем на розных узроўнях пазнання. Менавіта яны павінны быць раскрыты тады, калі неабходна бывае вылучыць аб’ектыўны змест і лагічную структуру паняцця сістэмы.

Расійскі філосаф і метадолаг Г.П.Шчадравіцкі ў 1974 г. падкрэсліў: сучасны сістэмны падыход не можа грунтавацца на традыцыйным разуменні сістэмы. Ён прапанаваў разглядаць аб’ект у выглядзе сістэмы, што складаецца з чатырох паслядоўных катэгорый: працэсаў пэўнага віду, функцыянальнай структуры, арганізацыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

матэрыялу і марфалогіі. Такі падыход дазваляе спалучаць працэсуальныя ўяўленні пра сістэму (напрыклад, эвалюцыйна-генетычныя) у адным рэчышчы з арганізацыйнымі і структурнымі.

Расійскі філосаф А.С.Арсеньеў падкрэслівае існаванне якаснай розніцы паміж арганічнымі і неарганічнымі сістэмамі (апошнія І.Кант называў механічнымі агрэгатамі). Арганічныя сістэмы маюць іерархічную структуру, іх развіццё адбываецца ў выглядзе фаз. Асаблівасць арганічных сістэм у тым, што спачатку на базе ранейшай структуры з'яўляецца новая функцыя, потым ужо ўтвараюцца новыя орган або структура, якія прызначаны ўжо якраз для выканання гэтай функцыі. У выпадку механічнай сістэмы адбываецца наадварот: спачатку структура штучна ствараецца, потым пачынае функцыяніраваць у строга акрэсленых межах.

У 1980-я гг. сярод штучных сістэм вылучыўся клас інструментальных сістэм. Паказчыкам якасці інструментальнай сістэмы лічаць яе прыстасаванасць да вырашэння суб'ектам пэўнай задачы. Інструментальная сістэма не мае цвёрда зафіксаванага набору прымет. Гэта дазваляе карыстальніку адбіраць патрэбную інфармацыю па класіфікацыйных адзнаках — фасетных, атрыбутных і інш. Натуральным атрыбутам інструментальнай сістэмы з'яўляецца функцыянальная празмернасць інфармацыйных сродкаў, якая павінна прасктавацца свядома. Таму вялікае значэнне для карыстальнікаў набывае факт персанальнай інфарматыўнасці кожнага элемента, характару яго ўзаемадзеяння з іншымі элементамі сістэмы. Гэтыя меркаванні належаць расійскаму даследчыку В.Л.Арлазараву.

Навуковыя веды ў галіне педагогікі, псіхалогіі ўтвараюць штучную сістэму. Галіновая навуковая бібліяграфія ў адносінах да навукі выконвае ролю інструментальнай сістэмы. Таму яна, з аднаго боку, з'яўляецца своеасаблівым "асімілятарам" дакументных (першасных) патокаў, з другога боку, выступае ў якасці самастойнай складанай навукі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Шэраг падстаў дазваляе разглядаць галіновую сістэму навуковай бібліяграфіі па педагогіцы і псіхалогіі як цэласную трыяду, што складаецца з наступных структурных утварэнняў: карыстальнікаў, бібліяграфічных дакументаў, інфармацыйна-культурных цэнтраў. Гэтыя віды структурных утварэнняў застаюцца ўстойлівымі і пры зменах сацыякультурнага асяроддзя. Кожны з падобных складаных аб'ектаў уяўляе своеасаблівы комплекс элементаў, адносіны паміж якімі паказваюць сябе ў выглядзе або сувязей, або працэсаў.

Мы зыходзім з такой метадалагічнай падставы: сістэмны падыход уяўляе разумовы інструмент, што дапамагае даследчыку павялічыць сілу абстрактных разважанняў. Сукупнасць элементаў і адносін паміж імі, якую даследчык выбірае для аналізу, пазначае тэрмінам "сістэма", дазваляе разглядаць апошнюю на адным або на ўсіх наступных узроўнях складанасці: макра-, меза- і мікраўзроўні.

На першым этапе выкарыстаем макрасістэмны аналіз, што прадугледжвае вылучэнне ў межах гранічна шырокай сукупнасці элементаў, якія ўтвараюць базавыя сувязі і працэсы. Галіновая сістэма навуковай бібліяграфіі па педагогіцы і псіхалогіі — гэта, на наш погляд, арганічная інструментальная сістэма. Яна мае адначасова іерархічную структуру, запраектаваную "празмернасць" функцыянальных сродкаў. Паміж элементамі ў сістэме існуюць адносіны двух тыпаў: прамыя і зваротныя.

На макраўзроўні ў галіновай сістэме навуковай бібліяграфіі па педагогіцы і псіхалогіі аналізуюцца наступныя структурныя аб'екты, адносіны паміж імі:

— макрагрупы карыстальнікаў галіновай інфармацыі (вучоныя, метадысты, супрацоўнікі, студэнты);

— асноўныя віды бібліяграфічных дакументаў (бібліяграфічныя выданні, каталогі і картатэкі, электронныя базы даных, якія адлюстроўваюць галіновую інфармацыю);



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

— тыпы інфармацыйна-культурных цэнтраў (актыўныя і пасіўныя).

На макраўзроўні кожная макрагрупа аналізуецца, перш за ўсё, з пункту гледжання адносін — працэсаў, сувязей яе з тымі макрагрупамі, што ўваходзяць у іншае структурнае ўтварэнне.

Мы лічым немэтазгодным павелічэнне колькасці базавых структурных утварэнняў да больш чым трох, бо гэта прывядзе да значнага ўзрастання колькасці элементаў і адносін паміж імі, а таксама да празмернага ўскладнення аналізу інструментальнай сістэмы даследчыкамі. Аналіз базавых працэсаў, якія пачынаюцца адразу пры нават невялікім трансфармаванні аднаго з трох структурных утварэнняў, дазваляе вызначыць шэсць магчымых варыянтаў такіх адносін. Кожны працэс мае такія абавязковыя этапы: пачатак, прамежкавы стан, заканчэнне. Пачатак працэсу сведчыць пра парушэнне гамеастазу ў сістэме. У ходзе працэсу сістэма імкнецца ўзнавіць парушаную раўнавагу, дасягнуць новага гамеастазу па прынцыпе "шаляў". Пры гэтым адбываецца відазмяненне структурных утварэнняў — карыстальнікаў, цэнтраў, бібліяграфічных дакументаў — у наступных аспектах: зніненне існуючых, трансфармацыя функцый, статуса былых, з'яўленне інавацыйных.

Базавы працэс, што ўмоўна назначаем як першы, пачынаецца са змены інфармацыйных патрэб макрагрупы карыстальнікаў, якія, у сваю чаргу, звяртаюцца за дакументамі непасрэдна ў пэўныя цэнтры. Гэты зварот карыстальнікаў вядзе да змены інфармацыйна-бібліяграфічнай дзейнасці адпаведных цэнтраў, потым да відазмянення аб'ёму галіновай бібліяграфіі.

Другі базавы працэс таксама пачынаецца са змены характару інфармацыйных патрэб асобных макрагруп карыстальнікаў, якія ў гэтым выпадку звяртаюцца непасрэдна да бібліяграфічных дакументаў, што знаходзяцца ў цэнтрах або за іх межамі. Потым гэта вядзе да трансфармацыі бібліяграфічнага інфармавання актыўнымі, пасіўнымі цэнтрамі або да ўзнікнення новых цэнтраў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Трэці базавы працэс характэрны для інфармацыйна-культурных цэнтраў, што пачынаюць змяняць асобныя накірункі дзейнасці. Менавіта ў апошніх выспявае новае разуменне перспектыў развіцця галіны. Цэнтры-інаватары пачынаюць ствараць бібліяграфічныя дакументы, якія адлюстроўваюць таксама перспектыўную інфармацыю. Пасля яны здзяйсняюць паступовае фарміраванне патрэб пэўных катэгорый карыстальнікаў у адпаведнай літаратуры, якая пакуль яшчэ не атрымала распаўсюджвання.

Чацвёрты базавы працэс у сістэме таксама пачынаецца з відазмянення цэнтраў, што фарміруюць розныя катэгорыі карыстальнікаў. Цэнтры аналізуюць цяжкасці карыстальнікаў у атрыманні галіновай інфармацыі, кола іншых праблем. Вывучэнне патрэб асноўных катэгорый карыстальнікаў дае цэнтрам магчымасць удасканаліць або падрыхтаваць патрэбныя галіновыя бібліяграфічныя выданні, электронныя базы даных, каталогі, картатэкі.

Пяты базавы працэс дазваляе высветліць: змяненне структуры функцый бібліяграфічнай інфармацыі ў галіне ўплывае, у сваю чаргу, на стан кола карыстальнікаў, на іх патрэбы. Пералічаныя змены вядуць да відазмянення статуса і функцый інфармацыйна-культурных цэнтраў.

Шосты базавы працэс паказвае, што з'яўленне і змяненне сучасных відаў бібліяграфічных дакументаў у Беларусі, за яе межамі вядзе да аптымізацыі навукова-аналітычнай дзейнасці актыўных цэнтраў, вывучэння і выкарыстання замежнага вопыту. Яны імкнуцца да поўнага інфармацыйнага аналізу галіновых дакументаў, ствараюць, удасканальваюць патрэбныя бібліяграфічныя выданні, электронныя базы даных, каталогі і картатэкі. Вынік апісанай з'явы — задавальненне ўзрастаючых патрэб карыстальнікаў у адпаведнай галіне шляхам выкарыстання мэтанакіраванай і каштоўнай бібліяграфічнай інфармацыі, саміх дакументаў.

На ўзроўні мезааналізу ў сістэме навуковай галіновай бібліяграфіі па педагогіцы і псіхалогіі разглядаюцца

іерархія інфармацыйных патрэб, таксанамічныя крытэрыі класіфікацыі бібліяграфічных дакументаў для кожнай макрагрупы карыстальнікаў. На мезаўзроўні вылучаюцца таксама класіфікацыйныя прыметы цэнтраў, што маюць дачыненне да пэўнай макрагрупы карыстальнікаў, назапашвання, захавання, выдання і распаўсюджвання бібліяграфічнай інфармацыі.

У працэсе мікрааналізу разглядаюцца ўзаемаадносіны асобных элементаў макрагрупы карыстальнікаў з пэўнымі групамі актыўных і пасіўных цэнтраў, асобнымі відамі бібліяграфічных дакументаў.

Калі структурнае ўтварэнне сістэмы не змяняецца на працягу доўгага часу пад уздзеяннем з боку іншых элементаў, то такія ўмовы вядуць да інфармацыйнага крызісу. Менавіта гэтую з'яву мы і назіраем сёння ў сістэме бібліяграфічнага інфармавання педагагічных і псіхалагічных навук Беларусі.

**Дубовік Н.В.,**
*аспірантка кафедры бібліятэказнаўства*

## ТЭАРЭТЫКА-МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ АСНОВЫ "PUBLIC RELATIONS" (ГРАМАДСКІХ СУВЯЗЕЙ) БІБЛІЯТЭК

У развітых краінах свету склаліся і актыўна дзейнічаюць службы "Public relations" (ПР), якія, з аднаго боку, прапагандуюць свае ўстановы, арганізацыі, фірмы, ствараюць іх імідж, а з другога — вывучаюць адпаведныя адносіны да іх.

У Рэспубліцы Беларусь гэтыя службы пакуль што робяць першыя крокі, робяць навобмацак, метадам спроб і памылак. У Мінску на працягу шасці гадоў дзейнічае, напрыклад, інстытут грамадскіх сувязей.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ